УДК 821.161.3

# АСАБЛІВАСЦІ ЖАНРУ ЛІТАРАТУРНАЙ КАЗКІ ПРАЗАІЧНАЙ ФОРМЫ (на прыкладзе творчасці У. Караткевіча)

***М.А. Швакава*** (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***Т.І. Борбат***,
канд. філал. навук, дацэнт

У самым пачатку свайго творчага шляху У. Караткевіч звярнуўся да беларускай гісторыі і фальклору. Гістарычны вопыт народа, яго цудоўную, незвычайную душу ўвасобіў пісьменнік у творах пад назвай «Казкі і легенды маей Радзімы». Народная творчасць заўсёды была трывалым і надзейным падмуркам для У Караткевіча, які разумеў вялікую значнасць казкі для выхавання ў дзяцей любові да сваёй радзімы, да роднай беларускай мовы. Нават дыпломная праца будучага пісьменніка была прысвечана даследаванню казкі. Таму гэты жанр у творчасці У Караткевіча быў невыпадковы, больш за тое, малады даследчык вызначыў і напрамак ідэйна-эстэтычных пошукаў, і асаблівасці стылю казак.

Уладзімір Караткевіч засвоіў казачныя сюжэты, вобразы і матывы, добра і зразумела перадаў народную мараль і этыку. Праявіў схільнасць пераважна да апрацоўкі чарадзейных, легендарных і анімалістычных казак, – слушна адзначыў А. Верабей [1, с. 85]. Шэраг цікавых казак стварыў пісьменнік у 1970-я гг. і на пачатку 1980-х гг. («Верабей, сава і птушыны суд», «Кацел з камсньчыкамі», «Нямоглы бацька», «Вясна ўвосень»). Ім уласцівы натуральнасць гучання, займальнасць сюжэта, пазнавальнасць, наяўнасць народных маральна-этычных крытэрыяў у ацэнцы рэчаіснасці. Пісьменнік паспяхова выкарыстоўвае казачныя вобразы і матывы. «Канцоўка ў яго казках часцей за ўсе шчаслівая» [1, с. 87].

Кніга «Вясна ўвосень» дазваляе прасачыць станаўленне таленту выдатнейшага майстра слова. Для творчасці У. Караткевіча-казачніка ўласціва: уменне перадаць таямнічасць, незвычайнасць самой рэальнасці; своеасаблівае выкарыстанне казачных сюжэтаў і вобразаў: асноўваючыся на традыцыйных матывах, пісьменнік трансфармуе іх, зыходзіць з уласнага разумення казачнага жанру; праяўленне ў творчасці міфалагічных архетыпаў; уменне зліць два светы – рэальны і «ўмоўнаіншасветны», з аднаго боку, пранікненне ў нетры прыроднага існавання, а з другога – цікавасць да патаемнага ў жыцці чалавека, яго мар і невыказаных жаданняў; павучальнасць, дыдактычнасць, імкненне да абуджэння дапытлівасці дзяцей; пастаноўка важнейшых філасофскіх і маральна-этычных праблем.

**Літаратура**

1. **Верабей, А.** Уладзімір Караткевіч: жыцце і творчасць / А. Верабей. – 2-е выд., дапрац. і выпраўл. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 271 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова